Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

Кафедра гісторыі і сацыяльных навук

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
С. Я. Новікаў

«___» ________20___ г.

ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны)

Для спецыяльнасцей:
6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)»
6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»
6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»
6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем моў)»

Укладальнікі: Новікаў С.Я., Грабянчук І. В.

Регистрационное свидетельство № 1142336437 от 11.11.2023
Доступ к интерактивному ресурсу по ссылке:
https://moodle.mslu.by/course/view.php?id=2385

Абмеркавана і зацверджана на пасяджэнні
Навукова-метадычнага савета МДЛУ
«___» __________20___ г., пратакол №___

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з’яўляецца важнай складовай часткай сістэмы сацыяльна-гуманітарных і грамадска-палітычных ведаў, трывалай асновай для вывучэння заканамернасцей і асаблівасцей развіцця беларускай нацыі ў міжваенны перыяд і гістарычных выпрабаванняў у час Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Вывучэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб ваенным мінулым і вытоках перамогі савецкага народа.

Вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з’яўляецца складовай часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі перакладчыкаў, лінгвістаў, спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі, выкладчыкаў.

Мэтай дадзенага электроннага вучэбна-метадычнага комплекса (далей – ЭВМК) з’яўляецца фарміраванне грамадска-палітычнага светапогляду студэнтаў, які будзе садзейнічаць іх самавызначэнню ў працэсе паглыбленага асэнсавання подзвігу савецкага народа і геапалітычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў з дапамогай сродкаў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

З мэты ЭВМК выцякаюць наступныя задачы:

– фарміраванне ў студэнтаў грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы;

– выхаванне ў студэнцкай моладзі пачуцця адказнасці за будучыню сваёй дзяржавы і сусветнага супольніцтва;

– фарміраванне ў студэнтаў ведаў аб гераічных і трагічных уроках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, паўсядзённым жыцці насельніцтва на акупаванай тэрыторыі і ў савецкім тыле, укладзе прадстаўнікоў шматнацыянальнага народа Беларусі ў разгром германскіх захопнікаў, уплыве ваенных падзей на лёсы народаў Савецкага Саюза і Еўропы.

У сістэме сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасцей 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)» / 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»; 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)» / 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»; 1-02 03 08 «Замежная мова» (з пазначэннем мовы) / 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)» вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з’яўляецца дысцыплінай кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

ЭВМК « Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны)» мае наступныя раздзелы:

1. Тэарэтычны раздзел, прадстаўлены канспектамі лекцый для дзённай і завочнай форм навучання.

2. Практычны раздзел, які ўключае планы семінарскіх заняткаў, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенні семінарскіх заняткаў, матэрыялы для самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне і графікі самастойнай работы студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання, а таксама патрабаванні да афармлення акадэмічнага рэферата (эсэ).

3. Раздзел кантролю ведаў, які змяшчае матэрыялы для бягучай і прамежкавай атэстацыі (заданні для кантролю па тэмах, тэставыя заданні, пытанні да дыферэнцыраванага заліку), крытэрыі аналізу гістарычных крыніц і матэрыялаў.

4. Дапаможны раздзел, які ўключае змястоўную частку вучэбнай праграмы, прыкладныя тэматычныя планы дысцыпліны і вучэбна-метадычныя карты для ўсіх форм навучання, пералік навучальных выданняў, рэкамендаваных для вывучэння вучэбнай дысцыпліны.

Вучэбна-метадычны комплекс можа быць выкарыстаны таксама для самастойнага навучання студэнтамі ў працэсе падрыхтоўкі да лекцыйных, семінарскіх заняткаў, а таксама да дыферэнцыраванага заліку.

*Метадычныя рэкамендацыі студэнтам па выкарыстанні вучэбна-метадычнага комплексу.*

Вывучэнне дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны)» варта пачаць з вывучэння структуры вучэбна-метадычнага комплексу, азнаёміцца са зместам яго раздзелаў. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на агульную колькасць гадзін для вывучэння прадмета, суадносіны лекцыйных і семінарскіх заняткаў, аб'ём самастойнай працы. Дадзеная інфармацыя ўтрымліваецца ў прыкладных тэматычных планах для дзённай і завочнай форм навучання, якія размешчаны ў дапаможным раздзеле.

Наступны этап работы – азнаямленне з графікам самастойнай работы, бібліяграфічным спісам.

Працаваць з матэрыялам дысцыпліны неабходна ў храналагічнай паслядоўнасці: скласці кароткі план работы па кожнай тэме, вывучыць прапанаваны канспект лекцый у тэарэтычным раздзеле.

Вывучэнне кожнай тэмы варта завяршаць адказамі на тэставыя заданні, якія знаходзяцца ў раздзеле кантролю ведаў. Пасля адказаў на тэсты і пытанні для самакантролю можна пераходзіць да засваення зместу наступнай тэмы.

Калі ў працэсе вывучэння вучэбнага матэрыялу спатрэбіцца веданне якіх-небудзь структурных адзінак з папярэдніх тэм, рэкамендуецца спачатку паўтарыць іх.

У тых выпадках, калі тэма ўтрымлівае заданні для самастойнай працы, неабходна строга прытрымлівацца тэрмінаў, адведзеных для гэтага віду работ. Жадаем поспехаў у вывучэнні дысцыпліны!